ISSN 0203-2031

# Адукацыя і Выхаванне

**У нумары:**

*Магчымыя прычыны перагрузкі школьнікаў*

*Беларускае маладзёжнае грамадскае аб'яднанне ратавальнікаў-пажарных*

*Педагагічны савет як сродак кіравання навучальна-выхаваўчым працэсам школы*

*Тэсціраванне ў адукацыі: замежны і айчынны вопыт*

*Сацыяльна-псіхалагічныя аспекты ўсынаўлення*

2 · 2007

# Ідэі калектывізму і індывідуалізму ў айчыннай этыка-педагагічнай думцы сярэднявечча

**В.С.Болбас**

**У артыкуле аналізуюцца асноўныя падыходы ў педагагічнай думцы сярэдневяковай Беларусі да калектывісцкіх і індывідуалістычных асноў грамадскага ўладкавання і адпаведнай пабудовы выхаваўчага працэсу. Робіцца параўнанне з аналагічнымі накірункамі развіцця педагагічнай тэорыі і практыкі ў Заходняй Еўропе і Расіі.**

*Праблема індывідуалізму і калектывізму з'яўляецца адной з асноватворных пры арганізацыі жыцця любога грамадства. Практычна самыя значныя адметнасці культур залежаць ад іх арыентацыі на калектыў альбо на асобу. На працягу развіцця цывілізацыі індывідуалізм і калектывізм сфарміраваліся ў якасці найважнейшых маральных прынцыпаў, якія вызначаюць прыярытэт адпаведных вартасцей сацыяльнай супольнасці. З этыка-філасофскіх пазіцый асэнсаванне праблемы было распачата яшчэ Дэмакрытам і сафістамі, пазней гэтага пытання не абыходзіў ні адзін грамадазнаўца. У самастойны накірунак вывучэнне гэтай праблемы аформілася ў канцы XVIII– пачатку XIX стагоддзяў. Ідэалогія індывідуалізму ў значнай ступені апраўдвала капіталістычныя пераўтварэнні Новага часу.*

*Дамінаванне калектывісцкіх ці індывідуалістычных тэндэнцый у грамадстве ў значнай ступені вызначае характар педагагічнай тэорыі і практыкі. Фактычна ўся педагагічная навука савецкага перыяду будавалася на прынцыпе калектывісцкага падыходу ў выхаванні. Гэты напрамак актыўна распрацоўвалі такія вучоныя, як Я.А.Аркін, П.П.Блонскі, Н.К.Крупская, А.С.Макаранка, А.П.Пінкевіч, М.М.Пістрак, В.М.Сарока-Расінскі, В.А.Сухамлінскі і іншыя.*

*Разглядаемай праблеме ўдзялялася істотная ўвага і ў педагагічнай тэорыі сучаснай Беларусі. Ускосна набыткі айчыннай педагагічнай думкі ў гэтым напрамку закранаюцца ў працах такіх даследчыкаў педагогікі ў нашай краіне, як Г.П.Арлова, В.У.Буткевіч, К.У.Гаўрылавец, В.А.Капранава, К.А.Кулінковіч, С.В.Сяліцкі, Г.Р.Сянькевіч, С.А.Умрэйка, І.Ф.Харламаў. Спецыяльнага даследавання, прысвечанага развіццю ідэй індывідуалізму і калектывізму ў педагагічнай думцы Беларусі, пакуль што не праводзілася.*

### Абшчыннасць язычніцтва

Ч.Дарвін, распрацоўваючы тэорыю паходжання чалавека, адзначаў, што маральныя пачуцці бяруць пачатак у пачуццях абшчыннасці, якія існуюць нават у жывёл. Вучоны ўказваў, што з развіццём разумовых здольнасцей абавязкова развіваецца і грамадскі інстынкт, які, на яго думку, з'яўляецца рухавіком развіцця маральных пачуццяў. Абапіраючыся на такія ўяўленні аб паходжанні маралі, многія вучоныя робяць заключэнне, што сама прырода з'яўляецца першакрыніцай усіх маральных паняццяў і наступнага развіцця маралі.

Як і ў іншых народаў, маральнае выхаванне з часоў свайго зараджэння насіла ў нас грамадскі характар. На працягу ўсяго свайго існавання наш народ меў цесную сувязь з жывой і нежывой прыродай, і гэта непасрэдна вызна-

чала характар і змест яго маральна-выхаваўчых ідэй. Са старажытных часоў нашы продкі спрабавалі выпрацаваць правілы супольнага жыцця з іншымі людзьмі, найбольш агульныя асновы паводзін, што садзейнічала фарміраванню агульначалавечых каштоўнасцей, не звязаных непасрэдна з канкрэтным гістарычным перыядам, культурай. Такім чынам, маральныя нормы і правілы грамадства ўтрымлівалі агульначалавечыя каштоўнасці і дапаўняліся асаблівасцямі самабытнай культуры народнасці. Паняцці дабра і зла выпрацоўваліся не на аснове іх дачынення да асобнага чалавека, а на аснове таго, чым яны з'яўляюцца для людской супольнасці. Увогуле, грамадскі лад жыцця з'яўляўся істотным фактарам развіцця маралі.

У эпоху язычніцтва выхаванне будавалася на калектывісцкіх пачатках. Пракопій Кесарыйскі ў «Вайне з готамі» апісваў усходніх славян як народ выключна калектывізаваны, «здаўна жыўшы ў народапраўстве... шчасце і няшчасце ў іх лічылася справай агульнай» (цыт. па: [1, с. 237]). А.І.Клібанаў адзначае, што «здаўна ў абшчыне існавалі няпісаныя, але ўсемагутныя рэгламентацыі, замацаваныя ідэалагічна ў племянных культах» [2, с. 14]. Выхаваннем маладога пакалення займаўся ўвесь род; больш таго, у перыяд родавага ладу па-за межамі абшчыны немагчыма было само існаванне чалавека, ізгоі былі асуджаны на немінучую смерць.

### Хрысціянскі калектывізм

Хрысціянская эпоха прынесла новае разуменне калектывізму. У многім грамадскі характар выхавання вынікае з сутнасці хрысціянскага веравучэння. Асабліва дзівосную сумяшчальнасць у гэтым напрамку выявілі візантыйскае хрысціянства і маральныя ўяўленні славян. Даследчыкі адзначаюць, што адной з асноўных рыс хрысціянства было вылучэнне ў якасці асноўнага прыярытэту ў жыцці чалавека не яго асабістага шчасця, а шчасця грамадства, справядлівасці, прызнання раўнапраўя ўсіх людзей, даравання крыўдаў [3, с. 105]. У праваслаўі заўсёды агульнае пераважае над адзінкавым. Але гэтае агульнае прадстае не ў безабліччных схемах, а ў канкрэтных асобах [4, с. 92]. Праваслаўе на ўсходнеславянскіх землях заснавала культ чалавека саборнага. Гэта выразна прасочваецца ў «Жыціі Еўфрасінні Полацкай», дзе гаворка ідзе аб тым, што асветніца ўсім



*Валерый Сяргеевіч Болбас,*
*кандыдат педагагічных навук,*
*прарэктар па вучэбнай рабоце Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя І.П.Шамякіна*

сваім жыццём прапаведвала адзінства людзей у дабрыні і супрацьстаяла варожасці, нянавісці, міжусобіцам [5, с. 78].

Найбольш яскравым праяўленнем саборнасці і калектывісцкага падыходу ў хрысціянскім выхаванні з'яўляюцца сумесныя малітвы, а таксама царкоўныя святы. Напрыклад, у «Жыціі...» апісана свята адкрыцця царквы Святога Спаса. Агіёграф само паняцце святочнасці трактуе як рэалізацыю вышэйшага прынцыпу духоўна-маральнага яднання ўсіх людзей [6, с. 72]. Адносіны чалавека і калектыву ён разглядае ў плане абавязкаў першага перад другім. Для таго каб быць карысным грамадству, чалавек павінен далучыцца да Бога, гэта значыць дасягнуць маральна-духоўнай дасканаласці. Маральныя імператывы паводзін чалавека, успрынятыя і ўсвядомленыя ім асабістыя абавязацельствы перад Богам з'яўляюцца адначасова і абавязацельствамі перад людзьмі.

У жыційнай літаратуры, якую можна аднесці да візантыйскага напрамку маральна-этычнай думкі Старажытнай Русі, лейтматывам праходзіць думка аб тым, што чалавек не можа дасягнуць маральнай дасканаласці індывідуальна. Толькі ў калектыве магчыма максімальнае раскрыццё ўсіх граней асобы. Менавіта там чалавек набывае ўпэўненасць у тым, што як асоба ён можа праявіцца ў адносінах з іншымі. Д.С.Ліхачоў адзначаў: «...чалавек быў у цэнтры ўвагі мастацтва феадалізму, але не чалавек сам па сабе, а ў якасці прадстаўніка пэўнага ася-

роддзя, пэўнай ступені на лесвіцы феадальных адносін» (цыт. па: [4, с. 92]). Сярэдневяковую культуру ўвогуле мала цікавіла індывідуальнасць.

Калектывісцкі падыход да арганізацыі працэсу маральнага выхавання з усёй паўнатой ажыццяўляўся на ўсходнеславянскіх землях у дзейнасці манастыроў. У «Жыцці Феадосія Пячорскага» падрабязна апісваецца быт манахаў, іх калектыўная праца і малітвы. Сам Феадосій і яго вучні ў аснову існавання ставілі калектыўны клопат адзін аб адным, а таксама аб навакольных людзях: «Во время голода святой печёт хлеб из лебеды для множества приходящих к нему, и горький хлеб чудесно становится сладким» (цыт. па: [7, с. 65]). Феадосій не толькі не ізаляваў свой манастыр ад навакольнай рэчаіснасці, але і паставіў яго ў самую цесную сувязь з мірскім грамадствам. Мысліцель дастаткова негатыўна адносіўся да ідэі пустэльніцкага адасаблення, самотніцтва. Манах, на яго думку, павінен быць у акружэнні сваёй брацii, у адваротным выпадку яго могуць чакаць цяжкія спакушэнні.

Аналагічныя працэсы адбываліся і на беларускіх землях. Прыродна-кліматычныя ўмовы, абшчыннае землекарыстанне, адсутнасць рабаўладальніцтва і іншыя гісторыка-генетычныя і культураўтваральныя фактары спрыялі выдзяленню беларусамі ў якасці вызначальных якасцей дасканалага чалавека тых, што скіроўвалі яго да абшчыннасці, супольнасці, фарміравалі спакойны, разважлівы характар. Схільнасць беларускага народа да калектывізму дасягнула найбольш высокага ўзроўню якраз у эпоху сярэднявечча. Шырокае распаўсюджанне набывае ў гэты час суседская абшчына. Жыхары аднаго ці некалькіх пасяленняў аб'ядноўваліся ў так званую грамаду, сумесна валодалі зямлёй, мелі ўласныя органы самакіравання. Гэтую схільнасць замацоўвалі і такія старадаўнія народныя звычаі, як талака, сябрына, бонда і інш.

**Індывідуалізм у этыцы хрысціянства**

Важна адзначыць, што ў адрозненне ад язычніцкага перыяду, калі паняцці дабра, маральнасці вызначаліся інтарэсамі толькі людской супольнасці, хрысціянская этыка акцэнтуе ўвагу і на ўзвышэнні кожнага індывіда, на неабходнасці адносіцца да іншых, як да самога сябе [6, с. 79]. Маральныя запаветы хрысціянства звяртаюцца ў асноўным да ўнутранага свету індывіда, яго сумлення. Нават абмежавальны характар маральных нормаў уяўляе не толькі абмежаванне дзейнасці чалавека адносна іншых, але ў першую чаргу ўстанаўленне міжуласных думак і ўчынкаў. Адносіны да іншых – гэта перш-наперш адносіны да самога сябе, што стварае аснову для таго, каб, як і ў этычных вучэннях антычнасці, абсалютнае дабро і ўласнае шчасце зліваліся ў адзінае цэлае.

Так, ужо ва Уладзіміра Манамаха і Данііла Заточніка мы знаходзім патрабаванне індывідуальнага падыходу да маральнага развіцця асобы. Абапіраючыся на думку аб разнастайнасці Сусвету, Манамах робіць вывад аб неаднолькавасці людзей. «Якія разнастайныя чалавечыя твары!», – здзіўляецца князь у сваім «Павучэнні» (цыт. па: [4, с. 92]). Прызнаючы індывідуальнасць кожнай асобы, мысліцель больш мякка і цярпіма, у параўнанні з іншымі аўтарамі, глядзіць на асабістае чалавечае жыццё.

Манамах захоўвае язычніцкае разуменне прыроды і чалавека ў ёй: усё, што існуе ў Сусвеце, «дал Бог на угодье людям, на веселье». Таму ні ў задавальненні плоці, ні ў мірскіх справах ён не бачыць нічога грахоўнага. Дабрачыннасць, карысная для грамадства праца – галоўны паказчык богаўгоднасці (чытай – маральнасці) чалавечага жыцця. Грамадзянскую актыўнасць, якая дапускае індывідуальнасць асобы, Манамах супрацьпастаўляе фанатычнаму выкананню царкоўна-манастырскіх устанаўленняў. Хто «церпіць... адзіноцтва, чарненне, голад» – лішнія людзі [8, с. 37].

Даніiл Заточнік у сваім «Маленні» першы ва ўсходнеславянскай сярэдневяковай маральна-этычнай думцы засяродзіў увагу на пачуццях і поглядах асобнага чалавека, прычым чалавека, не абцяжаранага рызай мітрапаліта, як Іларыён, або велікакняжацкай уладай, як Уладзімір Манамах. Чалавек у «Маленні» Даніiла Заточніка паўстае як асоба, якая вышэй за ўсё ставіць пачуццё асабістай годнасці і інтэлект, здольнасць крытычна мысліць. Аўтар адвяргае фармальную, знешнюю рэлігійнасць, ён падкрэслівае, што «богу нельзя солгати» (цыт. па: [9, с. 38]). Даніiл сцвярджае, што чалавек цікавы сам па сабе – незалежна ад саслоўнай прыналежнасці, сацыяльнага статусу. Адсюль вынікае, што ў маральным выхаванні неабходны індывідуальны падыход.

Згодна з евангельскімі ўяўленнямі, урата-

ванне чалавечай душы строга індывідуальнае і залежыць ад уласных намаганняў чалавека. З распаўсюджаннем хрысціянства, не памяншаючы важнасці калектывісцкіх, абшчынных прынцыпаў, пашыраецца індывідуалістычны кампанент. Прыклад Еўфрасінні Полацкай яскрава сведчыць аб тым, што дзякуючы індывідуальнаму падыходу яна дасягнула значных поспехаў у маральна-духоўным выхаванні сваіх сясцёр. У той жа час вынік маральна-духоўнага ўдасканалення асобы і грамадства асветніца бачыла найперш у грамадскай еднасці. Яна «всех хотяше имети, яко едину душу» (цыт. па: [7, с. 8]). Як і ў іншых хрысціянскіх святароў, індывідуальны падыход быў асноўным у прапаведніцка-выхаваўчай дзейнасці Клімента Смаляціча і Кірылы Тураўскага.

Такім чынам, у маральна-этычнай думцы Старажытнай Русі пры дамінаванні калектывісцкіх прынцыпаў у маральным выхаванні асобы акцэнтуецца ўвага і на індывідуальным падыходзе. У многім гэта сугучна хрысціянскай антрапалогіі. Так, В.В. Зяньkоўскі пісаў, што «прырода ў людзях не толькі аднолькава, але яна адна на ўсіх, а асоба ў кожнага свая – непараўнальная» [10, с. 124]. Менавіта асабістыя якасці з'яўляюцца творчым пачаткам у чалавеку: асоба можа змагацца са сваёй прыродай, уплываць на яе.

**Гарманізацыя падыходаў**

Геапалітычнае становішча Беларусі на мяжы заходняй і ўсходняй цывілізацый прадвызначае своеасаблівасць развіцця айчыннай духоўнай культуры. Істотны ўплыў на фарміраванне індывідуалістычных і калектывісцкіх прынцыпаў аказалі шматлікія ідэалагічныя фактары, сярод якіх найважнейшым быў фактар шматканфесійнасці. На беларускіх землях адносна мірна суіснавалі праваслаўе, каталіцызм, уніяцтва, пратэстантызм і інш. Адрозненні антрапалагічных дактрын розных веравучэнняў абумовілі фарміраванне розных падыходаў да маральна-духоўнага выхавання, у тым ліку і ў пытанні індывідуальнага і калектыўнага.

Усе хрысціянскія ідэолагі аднадушна сцвярджаюць, што кожны чалавек валодае свабодай волі і таму нясе адказнасць за свае ўчынкі. У праваслаўі, дзе свабодзе волі надавалі надзвычай важнае значэнне, лічыцца, што яна дапамагае кожнаму маральна ўдасканаліцца, пераўзысці самога сябе ў любві, пры неабходнасці – дайсці да самаахвяравання. Праваслаўе, удзяляючы шмат увагі чалавечай асобе, разглядала яе з пазіцый саборнасці, гэта значыць яднання людзей на аснове любві да Бога і прыярытэтнасці маральных каштоўнасцей. У каталіцызме «самаўладдзе душы» не выступае ў якасці вядучай парадыгмы развіцця асобы. Каталіцкі мысліцель А.Любак, спасылаючыся на «Пасланне да рымлян» апостала Паўла, адзначае: «Царква прадвызначана. Царква, і тым самым у ёй усялякі чалавек і ўвесь свет» [11, с. 170]. Аўгусцін Блажэнны закладвае асновы вучэння аб прадвызначэнні чалавека, якое аказала вызначальны ўплыў на ідэалогію каталіцызму. З аднаго боку, каталіцкая этыка значна абмяжоўвае свабоду волі, бо лічыць, што «жаданне нашай свабоды без межаў супярэчыць волі Бога» [11, с. 175], і таму чалавек павінен падаўляць сваю волю, імкнуцца да паслухмянасці. Але ж «у самой сваёй паслухмянасці розум знаходзіць рухаючы стымул» [11, с. 176]. Усё, што чалавек пазнае на гэтым шляху аб сабе самім, дапамагае яму асэнсаваць уласнае месца ў свеце і знайсці свой шлях уратавання. Менавіта адсюль ідуць вытокі індывідуалістычных ідэй, якія занялі дамінуючае становішча ў пропаведзі, нават у самой літургіі каталіцкай царквы.

Яшчэ больш спрыяльную глебу для развіцця індывідуалістычных ідэй ствараў на беларускіх землях з XVI стагоддзя пратэстанцкі рух. Прадстаўнікі Рэфармацыі абвясцілі права кожнага чалавека па-свойму інтэрпрэтаваць Біблію. Пратэстантызм дапускае магчымасць індывідуальнага ўратавання. Наогул, у этыцы рэфарматараў найважнейшае месца займала палажэнне аб асабістай адказнасці чалавека перад Богам без пасрэдніцтва афіцыйнай царквы. Згодна з ідэямі пратэстантызму, чым бліжэй чалавек да Бога, тым больш ён аддзяляецца ад зямной рэчаіснасці і адрозніваецца ад іншых. Каштоўнасць індывіда бачылася не ў прыналежнасці да пэўнай супольнасці, а, наадварот, у істотным адрозненні ад яе членаў. У далейшым у айчыннай этыка-педагагічнай думцы досыць арганічна спалучаліся патрабаванні індывідуальнага падыходу і грамадскага характару маральнага выхавання.

Небывалы ўзлёт ідэй індывідуалізму спарадзіла ў Заходняй і Цэнтральнай Еўропе эпоха Адраджэння. Погляды еўрапейскіх гуманістаў падчас нават супярэчылі хрысціянскаму вера-

вучэнню. Вера ў людзей, іх магчымасці, узвелічэнне кожнай асобы ўздымала індывіда да ўзроўню Бога. Падобнымі ідэямі была прасякнута і педагагічная думка еўрапейскіх краін.

З некаторым спазненнем еўрапейскі рэнесансавы рух дакаціўся і да беларускіх зямель. Адным з першых яго прадстаўнікоў стаў Францыск Скарына. Найвялікшая яго заслуга заключаецца ў тым, што ён паспрабаваў еўрапейскія рэнесансавыя ідэі спалучыць з асаблівасцямі светапогляду свайго народа. Гуманізм Скарыны – гэта ў значнай ступені хрысціянізаваны гуманізм заходнееўрапейцаў. Асветнік прапануе, з аднаго боку, скіраваць выхаваўчыя намаганні на фарміраванне асобы, якая бачыла б сэнс свайго жыцця ў служэнні «пожитку посполитому». З другога боку, ён падкрэслівае значнасць кожнага індывіда для грамадства і жадае, каб кожны чалавек і ўсе людзі «добре жили на свете» [12, с. 26].

Імкненнем аб'яднаць ідэі агульнага дабра і ўласнага шчасця прасякнуты працы Міколы Гусоўскага, Сымона Буднага, Яна Ліцынія Намыслоўскага, Васіля Цяпінскага, Сімяона Полацкага і іншых беларускіх мысліцеляў эпохі Адраджэння. Мікола Гусоўскі ўзорам арганізацыі супольнага жыцця лічыў зубрыны статак, дзе пануе прынцып: «Кожны – за гурт, гурт – за кожнага». Я.Намыслоўскі слушна адзначаў, што грамадства заўсёды павінна памятаць, што прырода схіляе кожнага індывіда да ўласных дзеянняў. С. Полацкі засяроджваў увагу на поглядах Арыстоцеля наконт чалавека як істоты «содружной».

**Народна-выхаваўчыя погляды**

Абшчынныя падыходы замацоўваліся і ў народнай педагогіцы Беларусі. Само паняцце дабра разумелася ў беларусаў як карысць для іншых, для грамадства. Скарбонка народнай мудрасці захоўвае шмат прыказак, якія падкрэсліваюць перавагу калектыўнага ладу жыцця: «Моцны статак чарадою, а людзі грамадою» [13, с. 374], «У гурце нішто не страшна» [13, с. 375], «Адзін дуб у полі – то не лес» [14, с. 83], «Калі робіш укупе, не баліць у пупе» [13, с. 374]. Тым не менш у народзе паступова фарміруецца ідэя аб неабходнасці ўліку ў грамадскім жыцці інтарэсаў канкрэтнай асобы. З'яўляюцца пастулаты, якія прапагандуюць пачуццё ўласнай годнасці, узвышэнне асабістага «Я». Робяцца спробы не пакінуць па-за ўвагай кожнага асобнага чалавека. «Няхай кажан сам сябе глядзіць» [14, с. 109], «Як пасцелеш сабе, так і выспішся» [13, с. 145] – зазначае народная мудрасць. Шырокія сувязі з краінамі Заходняй і Цэнтральнай Еўропы садзейнічалі пранікненню ў грамадскую свядомасць рэнесансавых індывідуалістычных ідэй. Падчас аграрнай рэформы XVI стагоддзя на беларускіх землях у многіх месцах абшчыннае землекарыстанне змянілася падворным, што разбурала абшчынны лад вясковага жыцця і ўсталёўвала прыватна-ўласніцкія, індывідуалістычныя тэндэнцыі. Для параўнання, у Расіі падобныя працэсы набралі сілу толькі ў пачатку XX стагоддзя, у сувязі са сталыпінскай рэформай. Сур'ёзным зменам у жыццёвым побыце і духоўнай культуры беларусаў спрыялі таксама такія якасці нацыянальнай псіхалогіі, як засяроджанасць на ўласным унутраным свеце, схільнасць да адзіноты. Тым не менш народная думка хоць і дапускала выражэнне індывідуальнасці, клопат аб уласным шчасці, на першы план вылучала агульныя інтарэсы, дабрабыт грамадства.

У этнічнай педагогіцы беларусаў таксама засяроджвалася ўвага на тым, што побач з агульнымі адметнасцямі дзяцей пэўнага ўзросту існуюць індывідуальныя асаблівасці. Народная мудрасць папярэджвала: «Не роўны лес, не роўныя людзі» [13, с. 377], «Кожны чалавек пасвойму жыве» [15, с. 199]. Арыентацыя на здольнасці і магчымасці канкрэтных дзяцей давала эфектыўныя выхаваўчыя вынікі.

*Такім чынам, адметнай асаблівасцю педагагічнай думкі сярэдневяковай Беларусі з'яўляецца тое, што айчынныя этыка-педагагічныя ідэі выразна скіраваны да супольнасці, абшчыннасці, агульнага дабра. Нават эпоха Адраджэння з яе сцвярджэннем індывідуалізму і адпаведныя ідэі Рэфармацыі на беларускіх землях не дасягнулі таго ўзроўню, да якога яны ўзняліся ў Цэнтральнай і Заходняй Еўропе.*

*Разам з тым падобная выснова не азначае ігнаравання ў айчыннай педагагічнай думцы індывідуальнага. Мэты, змест і шляхі арганізацыі выхаваўчых працэсаў, асабліва ў параўнанні з аналагічнымі ідэямі рускай грамадскапедагагічнай думкі, мелі на Беларусі значна большую індывідуалістычную скіраванасць. Але інтарэсы асобнага індывіда ніякім чынам не маглі быць задаволены праз нанясенне шкоды іншым.*

*Сучасным арганізатарам выхаваўчага*

*працэсу трэба ўлічваць дадзеную асаблівасць менталітэту беларусаў. Гэта не азначае, што мы не павінны разглядаць вопыт іншых краін у арганізацыі навучання і выхавання. Але некрытычны погляд на заходнія традыцыі, бяздумнае капіраванне чужых набыткаў наўрад ці прынясуць станоўчы вынік. Гіпертрафіраванае разуменне індывідуалізму – гэта якраз адзін са слабых бакоў сучаснага заходняга ладу жыцця. Нам варта ўзяць на ўзбраенне мудрасць нашых продкаў і імкнуцца да як мага большай гарманізацыі асабістага і грамадскага. Улічваючы асаблівасці айчынных этнапедагагічных ідэй і сучасныя накірункі развіцця цывілізацыі, мы абавязаны утылітарныя, геданістычныя погляды на сэнс чалавечага жыцця сумясціць з арыентацыяй на ідэі агульнага дабра. У гэтым напрамку выхавання мы маем трывалыя традыцыі. Па-першае, як адзначалася вышэй, вялікую дапамогу могуць аказаць ідэі нацыянальнай педагогікі. Па-другое, патрэбна асэнсавана, разважліва і крытычна выкарыстаць напрацоўкі педагогікі савецкага перыяду. Добры плён, як у тэарэтычных распрацоўках, так і ў практычным ажыццяўленні выхаваўчага працэсу, павінна прынесці выкарыстанне набыткаў хрысціянскай этыкі. Такі падыход дазволіць не парушыць пераемнасць у выхаванні нават у пераломныя перыяды грамадскага развіцця.*

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Прадмовы і пасляслоўі паслядоўнікаў Францыска Скарыны / уклад. У.Г.Кароткі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 309 с.
2. *Клибанов, А.И.* Духовная культура средневековой Руси / А.И.Клибанов. – М.: Аспект Пресс, 1996. – 368 с.
3. *Кропоткин, П.А.* Этика: избранные труды / П.А.Кропоткин. – М.: Политиздат, 1991. – 486 с.
4. *Забияко, А.П.* История древнерусской культуры / А.П.Забияко. – М.: Интерпракс, 1995. – 304 с.
5. Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры: вучэбны дапаможнік. – Мінск: Вуч.-пед. выд-ва Мін-ва асветы БССР, 1959. – 473 с.
6. *Майхрович, А.С.* Становление нравственного сознания: Из истории духовной культуры Беларуси / Нац. акад. наук Беларуси. Институт философии и права. Отделение научной информации по гуманитарным наукам. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1997. – 206 с.
7. *Федотов, Г.П.* Святые Древней Руси / Г.П.Федотов. – Ростов-на-Дону: Феникс, 1999. – 384 с.
8. *Галактионов, А.П.* История русской философии IX–XIX вв. / А.П.Галактионов, В.Ф.Никандров. – Ленинград: Изд-во Ленинградского ун-та, 1990. – 897 с.
9. *Новиков, А.И.* История русской философии / А.И.Новиков. – СПб.: Лань, 1998. – 320 с.
10. *Зеньковский, В.В.* Принципы православной антропологии / В.В.Зеньковский // Русское зарубежье в год тысячелетия крещения Руси. – М.: Политиздат, 1990. – С. 115–148.
11. *Анри де Любак.* Католичество. Социальные аспекты догмата / Анри де Любак. – Милан: Христианская Россия, 1992. – 614 с.
12. *Скарына, Ф.* Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія / уступ. арт., падрыхт. тэкстаў, камент., слоўнік А.Ф.Коршунава. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 207 с.
13. Прыказкі і прымаўкі: у 2 кн. / рэд. А.С.Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 1. – 560 с.
14. Прыказкі і прымаўкі: у 2 кн. рэд. / А.С.Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 2. – 616 с.
15. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / склад. Ф.Янкоўскі. – 3-яе выд., дапрац., дап. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 491 с.